КАМУНІСТЫЧНЫ САЮЗ МОЛАДЗІ ПОЛЬШЧЫ
(Сэкцыя Камуніст. Інтэрнацыяналу Моладзі).

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַראייניקט אייך!
Пролетарі всіх країн, єднайтеся!
Visu šalių proletarai, vienykites!

МАЛАДЫ КАМУНІСТ

ГАЗЭТА ЦК КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

№ 4 (53) | ВІЛЬНЯ, ліпень 1934 г. | Цана 5 гр.

ХАЙ ЖЫВЕ 1 ЖНІЎНЯ ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ!

1 ЖНІЎНЯ ДА ЗАБАСТОЎКІ, УСЕ НА УЛІЦУ ДА БАЯВЫХ МАСАВЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ ПАД СЬЦЯГАМІ КОМСОМОЛА!

У паветчы як ніколі пахне порахам і атрутнымі газамі. Імпэрыялістычная вайна на сёняшні дзень — больш чым калі рэальная небясьпека.

Апошніе пасяджэння женеўскіе канфэрэнцыі па „разбраенню" як і раней былі пустой гаварыльнай. Канфэрэнцыя па ініцыятыве Англіі, Германіі пры актыўным падтрыманні Польшчы сарвана.

Капіталістычные дзяржавы ліхаманкова рыхтуюцца да вайны. Яны выробляюць уселякіе зьнішчальныя сродкі: атрутныя газы, новага тыпу гарматы, павялічваюць паветраны і морскі флёты, рыхтуюць гарматная мяса — армію, каб пасладць мільёны працоў. на смерць і калецтва ў імя інтэрэсаў капіталістаў і — каб па новаму перадзеліць паміж драпежнікамі свет, зруйнаваць Савецкі Саюз.

Ваеныя пляны Японії, Англії, Германії і Польшчы усецела і адкрыта накіраваны супроць СССР. Японія і Англія марць аб раздзеле далёка-усходняга краю СССР, Германія і Польшча аб раздзеле Савецкай Украіны і Беларусіі.

Японія ужо аргаізовала разграбленне і удушэнне кітайскага народу, на тэрыторыі захвачанай ёю Манжурыю, якую яна ператварыла ў пляцдарм для нападу на Сав. Саюз.

Некалькі месяцаў цягнецца кровопралітная вайна паміж Парагваем і Балівіей.

Адзін Савецкі Саюз стаіць як гранітны уцес сярод капіталістычных краін не пахістны у барацьбе за мір, за поўнае разбраеньне. Мірную палітыку СССР падтрымліваюць мільёны працоўных усяго сьвету. Яны знаюць як цану сусветнай імперыялістычнай вайны 1914-18 г.г. Гэта вайна закапала ў могілу 22 міл. людзей, амаль што столькі колькі ёсць у Польшчы (насельніцтва Польшчы каля 23 міл. чал.). Гэта вайна каля 25 міл. чал. пусьціла на сьвет калекамі, жабракамі. І усё гэта рабілась у імя інтэрэсаў капіталістаў, у імя аграблення працоўных. Хто можа недапусьціць зьнішчальнага пажару імпэрыялістычнай вайны? Могуць недапусьціць працоўныя, сваей арганізованай барацьбой супроць вайны. Працоўнай моладзі ў гэтай барацьбе належа самае ганаровае месца, таму, што працоўная моладзь будзе першай охвярай гэтай вайны.

Камуністычны Інтэрнацыянал, Кампартыя, Камсамол, заклікаюць усіх працоўных, працоўную моладзь у дзень 1-га жніўня да ўсеагульнай забастоўкі на прадпрыемствах, месных работах, копальнях, маёнтках, да масавых антываеныя дэманстрацый, мітынгаў. Прац. моладзь вёскі павінна таксама арганізаваць дэманстрацыі пад гміны, антываеныя вечары. Моладзь гораду і вёскі павінна навязаць кантакты з салдатамі, арганізаваць сумесныя вечары.

Каб арганізавана правесьці антываены дзень першага жніўня трэба загадзёў разгарнуць падрыхтоўчую работу на прадпрыемствах і вёсцы.

НА БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫХ ЛЯГЭРАУ!

19-га чэрвеня фашысцкі урад Польшчы выдаў новы дэкрэт аб арганізацыі канцэнтрацыйных лягэрэй „для прыступнага антыпаньствовага элемента" гэта значыць для ўсіх тых хто асьмеліцца ўзьняць голас незадавальненьня фашыстоўскім урадам — урадам акупацыі, вайны, грабежу і голаду. Усякі заключонны ў лягэры павінен адпрацаваць там 3 месяцы. Калі фашысты шляхам стасавання сярэдневяковых метадаў катавання недаб'юцца „перавыхаваньня" рэвалюцыйнага рабочага ці сяляніна, на працягу трох месяцаў яго яшчэ заключаць на тры месяцы потым яшчэ на тры і так да няабмяжованага часу.

У дадатак да дзесятка тысяч кінутых у турмы рабочых і селян, тысяч закатаваных на сьмерць і скалечаных, соцень праведзеных пацыфікацый праз карные экспэдыцыі, шмат тысячныя масы галадаючых, безпраўных — фашызм уводзіць канцэнтрацыйные лягэры як сродак удушэння рэвалюцыйнага руху і каб прадаўжаць свае панаванне. Але няўдасьцца гэта фашыстоўскім катам. Высока узнімаецца хваля рэвалюцыйнага руху. Хутка набліжаецца час канчатковай расплаты.

Новы дэкрэт выклікаў вялікае абурэньня сярод працоўных мас гораду і вёскі.

Але працоўная моладзь павінна ўсьвядаміць сабе, што аднаго абурэння мала, каб адбіць новую фашысцкую атаку. Патрэбны неадкладные, рашучые, самаахвярные дзеяння.

У працоўных ЗБ, маладых пралетарыяў і сялян ёсьць адзіны шлях — шлях арганізованай рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашыстоўскага ўраду з яго тэрарастычнай, грабежніцкай палітыкай.

Камуністычная партыя, камсамол заклікаюць працоўныя масы, працоўнаю моладзь смела стаць на гэты шлях.

Кожны павінень зразумець, што гэты шлях указаны Кампартыяй адзіна правільны. Ідучы гэтам шляхам рабочыя і працоўныя сяляне б. царскай Расіі скінулі цара, адбілі атакі інтэрвентоў і утварылі на 6-й часьцы зямной кулі вялікі СССР, дзе німа эксплёатацыі чалавека чалавекам, німа нацыянальнага уціску, німа безпрацоўя і безьзямельля, дзе усе працоўныя жывуць шчасьліва.

Працоўная моладзь ЗБ няхоча каб фашызм мацней зацісну пятлю эксплёатацыі, акупацыі і тэрора, няхоча запоўніць сабой канцэнтрацыйныя лягэры — таму яна будзе змагацца рашуча і самаатданна.

Сіла ў арганізованасьці і рашучасьці дзеянняў — гэтыя словы Уладзімір Ільіч Ленін заўсёды казаў расейскім рабочым, калі яны рыхтаваліся да адпору наступаючаму капіталізму.

Быць ці ня быць канцэнтрацыйным лягэрам, гэтам залежыць ад саміх працоўных, ад многатысячнай масы працоўнай моладзі.

Працоўные масы гораду і вёскі сілай сваей арганізованасьці могуць адбіць фашысцкую атаку, могуць недапусьціць правадзеньня дэкрэту ў жыцьце.

Варшаўскія рабочыя распачалі барацьбу справа за рабочымі і прац. селянамі ЗБ. у гарадах, на прадпрыемствах, мястэчках, селах, маёнтках працоўная моладзь пад кіраўніцтвам кампартыі і камсамола павінна арганізоўваць забастоўкі, мітынгі, дэманстрацыі, прынімаць рэзалюцыі протэсту. На прадпрыемствах, селах, маёнтках арганізаваць дружыны самаабароны праз якіе недаць арыштаваць і заключыць у лягэр ніводнага рабочага і сяляніна. Працоўные масы усілах адбіць і адаб'юць чарговае тэрорыстычнае неступленьня фашызму.

СЯКЕРА КАТА УЗНЯЛА НАД ГАЛАВОЙ ТАВ. ТЭЛЬМАНА.

Хто ня чў пра т. Тэльмана? Хто ня чў пра сына гамбурскіх рабочых, пра гэтага няўстрашымага змагара нямецкага пралетарыяту? Тэльман сакратар Ц.К. слаўнай кампартыі Нямечыны, член Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу — рабочые некалькі разоў высоўвалі кандыдатуру т. Тэльмана на прэзэдэнта Нямечыны, 5 мільёнаў галасоў пададзена за яго ў прэдапошніх выборах.

Калі дзякуючы здрадзе правадыроў С.Д. партыі прышоў да улады крававы кат рабочае клясы — Адольф Гітлер на ўсей Нямечыне разбушавалась хваля крывавага тэрору. Сотні камуністаў, камсамольцаў і рэвалюцыйных рабочых Нямечыны забіты, тысячы кінуты ў турмы і канцэнтрацыйныя лягэры.

Фашыстоўскі урад кіну за турэмные краты правадыра кампартыі Нямечыны т. Тэльмана падтвергаючы яго катаванню, трымаючы дзень і ноч закутага ў кайданы.

Кампартыя загнана ў глыбокая падпольля адкуль вядзе сваю гераічную барацьбу, высока трымае штандар рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыята з фашызмам. Гітлер і яго крывавая банда рыхтуюць разправу над т. Тэльманам.

Пасьля правала фашысцкай правакацыі на Лейпцыскім працэсе над т. т. Дымітравым, Паповым і Таневым, фашысцкі ўрад у таемніцах паліцэйскіх камор шукуе смертны прыгавор т. Тэльману.

Сякера ката ўзнята над галавой т. Тэльмана. Выратаваць т. Тэльмана зараз можа толькі магутны рух працоўных усяго сьвету. Працоўныя ўжо раз сваей барацьбой вырвалі з кіпцюроў фашызма з пад сякеры катоў т. т. Дымітрова, Папова і Танева, Яны могуць і яны выратуюць т. Тэльмана.

Працоўные масы, працоўная моладзь З.Б! Кампартыя, Камсамол заклікаюць вас на барацьбу за ВЫРАТАВАННЕ т. Тэльмана, да барацьбы з фашысцкім тэрорам, з уладаю капіталістаў.

Падымайце свой магутны голас протэсту, арганізоўвайце камітэты сходы, мітынгі прымайце рэзалюцыі протэсту арганізоўвайце камітэты барацьбы за асвабажденне т. Тэльмана і ўсіх палітзьняволеных.

Прэч крывавыя катоўскія рукі ад т. Тэльмана!

Працоўные ўсей Польшчы рыхтуюцца да рабоча-сялянскага кангрэсу на Зах. Украіне.

Выкрыццё контррэволюцыйных нацдэмоўскіх груп у БССР і УССР нанесла моцны ўдар па Украінскай і Беларускай буржуазіі раскрыла іх манэўры, інтэрвэнцыяніскіе планы імпэрыялізма і дапамагло працоўным ачысціць свае нацвызваленчые арганізацыі ад агэнтаў ворага. Пагэтаму так шалее ўся буржуазная свора брэшучы на Савецкі Саюз, пагэтаму яны ўзнялі такі енк аб „голадзе ў СССР", „зьніштажэнні нацкультур" стараючыся адзін другога перакрычаць і перахітрыць у майстраванні ўсякай хлусні і бязглуздзіцы.

Усё гэта робіцца буржуазіяй і яе служкамі нацфашыстамі каб абмануць масы і замаскаваць свае планы ваенага нападу на СССР.

Украінскім і беларускім буржуям хацелася-б вернуць памятные часы петлураўскага; Булак-Балахоўскага і белапольскага разгулу, грабежа і растрэлаў соцень і тысяч рабочых і сялян.

Пагэтаму і Украінская і Беларуская буржуазія рыхтуюцца да нападу на СССР. Украінскіе фашысты і сацыялістычные субраты групуюць свае сілы пад кіраўніцтвам і пры дапамозе Гітлера-Гэрынга-Розэнберга якім хочацца быць гаспадарамі багаццяў Данбаса. Робяць яны гэта і пад кіраўніцтвам ката Пілсудскага які здаўна прагне атабраць калгасные палі для сваіх памешчыкаў, здабыць рынкі збыту для сваіх капіталістаў.

З гэтаю мэтаю украінская буржуазія стварае розные фашысцкіе мілітарыстычные арганізацыі моладзі. Пад кіраўніцтвам вядомага ката працоўных Кіева Канавальца арганізавана У.В.О., скалачваюцца фашысцкіе ваенные кадры для арганізацыі ва УССР сабатажа ўнутры і вайсковага нападу звонку.

Украінская буржуазія цяпер ліхаманкова праводзіць „ідэлёгічную" падрыхтоўку да нападу на СССР, атручвае масы працоўнай моладзі ядам разузданага нацыяналізму. Украінская буржуазія адкрыта заклікае да забойства ўсякага сьвядомага рабочага і сяляніна, ўсякага змагара нацвызваленчага руху.

фашыстоўскіе боёвкі арганізоўваюць напады на рэвалюцыйных рабочых і сялян, падпальваюць іх маемасьць.

Найбольш яркімі фактамі падобнага фашысцкага тэрору за апошніе часы зьяўляецца замах на савецкае пасольства ў Львове, кінутая бомба ў памешканне рэдакцыі газэты нацвызваленчага руху „Праця".

У гэтых-жа мэтых, у мэтых кансалідацыі сваіх сіл і падрыхтоўкі вайны украінская буржуазія склікае кангрэс буржуазных нацыяналістычных сіл.

Працоўные масы Украіны гэраічна адбіваюць атакі ворага і пераходзяць на асобных вучастках ў контрнаступленне. Очышчаючыся ад буржуазнай агэнтуры якіе пралезлі нават у кіраўніцтва КПЗУ (Косар Барбара) працоўные масы ствараюць масавую самаабарону для барацьбы з боёвкамі фашыстаў.

У процівалегласьці буржуазнаму кангрэсу працоўные Украіны склікаюць свой рабоча- сялянскі кангрэс ва Львове.

Гэты кангрэс мае вялізарнае значэнне для інтэрнацыянальнага згуртавання працоўных у барацьбе з разюшаным нацыяналізмам, шовінізмамі, антысэмітызмам, з ваяўнічымі інтэрвэнцкімі планамі буржуазіі. Па ўсей Польшчы арганізоўваюцца кангрэсовые камітэты, абіраюцца масава дэлегаты на кангрэс.

Працоўная моладзь Зах. Беларусі якая вела і вядзе гэраічнае змаганне з польскім імпэрыялізмам, з беларускай буржуазіяй, з нацфашызмам з нацыяналізмамі, якая абараняе ТБШ ад разгрому, змагаецца супроць Шырмаў, Марцінчыкаў павінна падтрымаць барацьбу украінскіх працоўных мас. Працоўная моладзь на сходах, масоўках, мітынгах павінна салідарызавацца з украінскімі працоўнымі падтрымаць іх ініцыятыву аб скліканні кангрэсу, ствараць кангрэсовые камітэты з моладзі, абіраць дэлегатаў, збіраць грошы для іх паездкі ў Львов. Нахай малады працоўные З.Б. выступяць на кангрэсе раскажуць аб нашай барацьбе, завераць кангрэс што працоўные З.Б. іх моладзь пад кіраўніцтвам кампартыі і камсамолу разам з працоўнымі ўсей Польшчы інтэрнацыянальным фронтам будуць самааддана змагацца фашызмам супроць нападу на СССР, за рэвалюцыйны выхад з крызысу, за дыктатуру пралетарыята!

ПРЭЧ БРУДНЫЕ ФАШЫСТОЎСКІЕ РУКІ АД Т.Б.Ш.

17 чэрвеня бяг. году ў Вільне маў адбыцца краевы з'езд таварыства беларускай школы. Паліцыя забараніла гэты з'езд, арыштавала ўсіх дэлегатаў і пратрымала іх ў цэнтральцы некалькі дзён. За тыдзен да гэтага, 10 чэрвеня ў Беластоку паліцыяй быў забаронены акруговы з'езд. Уладамі завешаны ўсе акруговые ўправы, пазакрываны і розогнана мноства гурткоў ТБШ. Усе гэтые факты акупанцкага фашыстоўскага тэрору разлічаны на тое каб канчаткова разграміць ТБШ, нанесьці смяротны ўдар усяму нацвызваленчаму руху на Зах. Беларусі.

У сваей барацьбе з нацвызваленчым рухам, каб задушыць гэты растучы рэвалюцыйны рух, фашысцкі акупант ня цураецца самых грубых самых подлых і брудных спосабаў. Адным з такіх спосабаў з'яўляецца правакацыя праз пасылку сваіх наймітаў, прадажных служкаў у арганізацыі нацвызваленчага руху. Фашызм паслаў Дварчанінаў, Бурсевічаў, Рак-Міхалоўскіх у „Грамаду" „Змаганне", а пазней Стэцкевічаў, Марцінчыкаў, Шырмаў у ТБШ. Гэтые тыповые прэдстаўнікі Беларускай буржуазіі і кулацтва выконваючы ўказанні свайго фашыстоўскага гаспадара хацелі сполёнізаваць, сфашызаваць ТБШ — ператварыць яго ў паслухмяную зброю ў руках акупантаў. Масы тэбэшоўцаў выкрылі гэтую нацфашыстоўскую агэнтуру, здэмаскавалі манэўры ворага, ўзняліся на барацьбу супроць фашызму і яго нацфашыстоўскай агэнтуры. Негледзячы на дзікі тэрор расце і разівяецца ТБШ, лепшым доказам гэтага з'яўляецца тое што гурткі ТБШ з усіх куткоў З.Б. прыслалі на з'езд звыш 50 чалавек сваіх дэлегатаў з тым каб на гэтым з'ездзе яшчэ раз заклеймiць Стэцкевічаў, Марцінчыкаў Шырмаў як лютых ворагаў працоўных, канчаткова ізаляваць гэтую банду ад ТБШ і абраць галоўную ўправу з рабочых і сялян.

Цяпер калі фашызм хоча канчаткова разграміць ТБШ мільённые масы працоўных больш чым калі арганізована і згуртавана павінны выступіць у абарону сваей кроўнай, уласнымі рукамі створанай і выпеставанай культурна-асветнай арганізацыі.

У гэтай гэраічнай барацьбе пачотная роля належыць працоўнай моладзі і яе кіраўніку камсамолу.

Змагаючшая пад штандарамі камунізма камсамол і кіруемая ім працоўная моладзь павінны разгарнуць шырока масавую работу па заградах, на фабрыках і заводах, вёсках фальварках склікаць сходы, масоўкі прымаць рэзалюцыі пратэсту. Разам з тым патрэбна ўсямерна разьвіваць дзеяльнасць гурткоў ТБШ арганізоўваць новые гурткі. Гуртаваць працоўную моладзь вакол ТБШ, арганізоўваць в кулкі моладзі, драмгурткі самаадукацый і г. д. Камсамол і працоўная моладзь і разам з ТБШ павінны асабліва цяпер перад новага навучальнага году шырока разгарнуць барацьбу супроць полёнізацыі гнаць полёнізатараў змагацца адзіным фронтам працоўных усіх нацыянальнасьцяў супроць акупанцкага сацыянальнага і нацыянальнага ўціску, супроць нацыяналістычнай антысэміцкай гэцы. Няхай па ўсіх кутках прыцісьнутай ботам фашыстоўскага акупанта Зах. Беларусі магутна праграміць. Прэч крывавые фашыстоўскіе рукі ад ТБШ і ўсяго нацвызваленчага руху.

За дзяржаўную школу ў беларускай мове!

За самавызначэнне акупаванай Зах. Беларусі аж да адзялення ад Польшчы.

Прэч канцэнтрацыйных лягэроў, турмаў, акупацыі, голаду тэрору! За ўладу Саветаў!

Шырока разгарнуць падрыхтоўку да антываен. жаночнага кангрэсу.

1 жніўня — ў дзень 20 гадавіны сусьветнай імпэрыялістычнай вайны зьбіраецца ў Парыжы міжнародны антываенны кангрэс жанчын.

Працоўныя масы незагаілі яшчэ раны вайны, не забылі яшчэ 20 мільёнаў сваіх братоў забітых і столькі-ж пакалечаных, як зьбіраюцца новыя хмуры зноў пагражаючые братазабойчай рэзьнёю больш страшнай, больш крывапралітнай.

Міжнародные разбойнікі рыхтуюць новую вайну скіраваную сваім вастрэнім супроць інтэрэсаў працоўных, супроць іх сацыялістычнай бацькаўшчыны — Савецкага Саюза.

Мільёные масы працоўнай моладзі заганяюцца ў мілітарыстычные арганізацыі, карные экспэдыцыі высіскаюць апошні грош з галоднага рабочага і селяніна вырабляюць гарматы, газы, танкі для вайны. Моладзь зноў хочуць пэратварыць у гарматнае мяса для фабрыкантаў і памешчыкаў.

Працоўная жанчына — матка і жонка салдата абесправленая і прыгнечаная капіталізмам, вымушаная цягнуць цяжкую мямку — эксплёатацыі, прымушаная шпер за грошы працаваць у панскіх цемнага да цемнага — ў час вайны асуджана на жабрацтва і літаральны голад.

Працоўные масы, моладзь і жанчыны няхочуць імпэрыялістычнай вайны. Яны гатовы змагацца супроць імпэрыялістычнай вайны. Гэтую гатоўнасць трэба пэратварыць у канкрэтные справы і ўжо сягоння шырока развіць антываенную работу.

Комсамол па ўсей Зах. Беларусі праводзіць антываенные злёты, сходы, конфэрэнцыі. Працоўная моладзь пад кіраўніцтвам партыі і комсамолу павінна прымаць у праваздімым актыўнейшы ўдзел, арганізаваць чым больш гэтых сходаў і канфэрэнцыі, прымаць на іх рэзалюцыі і дэкларацыі супроць падрыхтоўкі вайны, выбіраць антываенные камітэты.

Абовязок працоўных жанчын масава выступаць супроць імпэрыялістычнай вайны і яе падпальшчыкаў. Трэба паўсюдна праводзіць сходы, канфэрэнцыі працоўных жанчын, выбіраць на іх дэлетак на кангрэс, зьбіраць грошы для іх пасылкі ў Парыж.

Магутным антываенным рэвалюцыйным рухам выступім супроць імпэрыялістычнай вайны, недапусьцім новай рэзьні, грудзю будзем абараняць СССР — адзіны аплот міра і бацькаўшчыну працоўных ўсяго света.

Н—скі.

Польскія і літоўскія імпэрыялісты дагаварываюцца.

Вялікі шум узняты ў апошніе часы (ў польскіх газэтах) аб Літве. Немецкі фашызм напірае на клайпэдзію (частка Літвы) фінансуе свае арганізацыі, грозіць захопам Літвы. Літва хоча выкарыстаць польска-нямецкіе супярэчнасьці і шукае паразумення з Польшчай. Польскі імпэрыялізм несупроць таго каб захапіць Літву стварыць з ёю „фэдэрацыю". Але польскі імпэрыялізм захапіў літоўскіе обласьці што завайстрала да гэтага ўзаемаадносіны паміж польскай і літоўскай буржуазіяй. Зараз Польшча адчувае сабе мацнейшай ад Літвы і хоча дыктаваць ей свае ўмовы. Разам з тым для Польшчы невыгодна завайстраць узаемаадносіны з немцкім фашызмам (а польска літовская згода да гэтага вядзе) калі яна неадтрымае рэальных рэзультатаў — г. значыць калі непадпарадкуе сабе Літву.

Частка літоўскай буржуазіі імкнецца да таго каб дагаварыцца з Нямеччынаю падпарадкавацца ей і ўключыцца ў антысавецкі блок паводле плана Розэнбэрга. Гэтая частка літоўскай буржуазіі спрабавала зрабіць пераварот у Літве і паставіць на мейсца цеперашняга дыктатара Смэтана быв. дыктатара — Вальдэмараса. Гэта аднак няўдалася. Правячая кліка літоўскай буржуазіі працягвае шукаць згоды з Польшчай, Літоўскіе палітыкі прыежджаюць у Польшчу „прыватна" і вядуць „неафіцыйные" размовы з Пільсудскім, так сама „прыватна" ездзіў у Літву Прыстар — былі прэмэер і дагаварваўся „неафіцыяльна" з літоўскімі катамі працоўных.

Усе гэтые імпэрыялістычные комбінацыі скірованы супроць інтэрэсаў шырокіх мас працоўных Польшчы і Літвы. „Прыгожасці" Польскай акупацыі працоўным даўно вядомы.

У адказ на ўсе гэтые комбінацыі працоўные павінны ўзмацніць фронт інтэрнацыянальнай барацьбы. Узмацняючы барацьбу з польскай крывавай акупацыяй працоўные павінны змагацца з замысламі, з драпежніцкай дзейнасьцю літоўскай буржуазіі.

Працоўныя літоўцы разам з беларусамі, палякамі, украінцамі, яўрэямі павінны выступіць супроць тэрору акупанта, супроць карных экспэдыцыі, супроць полёнізацыі, за дзяржаўную школу на літоўскай, беларускай, украінскай, я рэйскай мовах, за права літоўскіх обласьцей да самавызначэння аж да аддзялення ад Польшчы.

Працоўная літоўская моладзь! Ганіце прэч з сваіх шэрагаў агентаў літоўскай буржуазіі, выходзьце масова з фашыстоўскіх арганізацый „Св. Казіміжа" і „Культуры"!

Комсамольцы! Стварайце ўсюды свае ячэйкі, змагайцеся за моладзь адурманенную фашыстоўскімі арганізацыямі!

Прэч з нападам на СССР
Усе да абароны міжнароднай пралетарскай бацькаўшчынай!

Адказы чытачом нашай газэты, па нацыянальнаму пытанню у БССР.

Рад пытанняў з жыцьця БССР, хваляюць працоўную моладзь З.Б. Гэта зусім зразумела. Буржуазны друк, кроўныя прадстаўнікі беларускай буржуазіі Луцкевіч, Астроўскі і ўся хэўра нацфашыстаў гаўкаюць з пад фашыстоўскай падваротні, выдумляюць усякіе ілжывые плёткі на компарт. БССР (КП(б)Б), на Савецкі Урад, на працоўныя БССР.

Праўда, КПЗБ даўно абвергла гэтую хлусню паноў і іх халуеў. Працоўныя масы З.Б. знаюць што дала працоўным палітыка компартыі. Але паколькі асобным т. т. асобныя пытанні недастаткова зразумелы, нашы доўг даць адказ на гэтые пытанні.

ПЫТАННЯ ПЕРШАЕ: (Н.У—чу)

Ці магла-б БССР існаваць як самастойная незал. Сац. Рэспубліка без далучэння да СССР?

АДКАЗ. Як Сацыялістычная Рэспубліка БССР існаваць немагла-бы. Чаму? Яе даўно бы разцерзалі на кавалачкі капіталістычныя дзяржавы, а працоўные апынуліся-б пад ярмо паноў. Таму іменна па жаданню працоўных БССР дабрахвотна далучылася да Савецкага Саюзу як асобная нацыянальная рэспубліка са сваім урадам, з установамі, школамі, тэатрамі клубамі на роднай мове. Мы ведаем што польскіе імпэрыялісты не адзін раз спробавалі з дапамогаю Луцкевічаў, Астроўскіх Дварчанінаў адарваць цяперашнюю тэрыторыю БССР ад СССР і далучыць да Польшчы. Калі-б гэта здарылася нецяжка сабе ўявіць што-б адтрымалі працоўные. Адтрымалі-б тое што „маюць" працоўные Заходняй Беларусі. Фабрыкі і заводы былі-б адданы капіталістам. Зямля была-б адабрана ад калгасьнікаў і аддана памешчыкам, у вёску наслалі-б карные экспэдыцыі, наклалі-б падаткі і г. д. у горадзе тысячы беспрацоўные памералі-б з голаду.

Няхочуць гэтага працоўные БССР таму і жывуць у саюзе з усімі савецкімі рэспублікамі а не з панамі пад іх ярмом.

Ды гэта і ня дзіўна. БССР нямае свайго вугалю, нафты, трактарных і аўтамабільных заводаў, немала раней амаль аніякай прамысловасці. Іменна дзякуючы савецкаму саюзу у БССР з дапамогаю працоўных усяго Саюзу узбудавана буйная прамысловасць, 3000 трактароў апрацоўваюць калгасные палі дзе былые беднякі і серадняки будуюць заможнае жыццё. У БССР ёсць дастаткова нафты, каменнага вугалю, аўтамабіляў. Усе гэта даюць як брат брату працоўные саюзу. А чы далі-б гэта капіталісты? Наш чытач добра ведае што „дае" працоўнаму фашызм яго паліцыя і нацфашыстоўскіе служкі. Дык няхочуць паўтараем, гэтага працоўные БССР таму і жывуць у саюзе з саветамі, а не пад ярмом паноў.

ПЫТАННЕ ДРУГОЕ: (На—ка) Ці праўда, што ў БССР уціскаецца беларуская мова?

АДКАЗ: гэта брахня, якую змайстравалі Луцкевічы і Астроўскія. Яны асабліва моцна пачалі брахаць у сувязі з некаторымі зьменамі ў беларускай граматыцы.

Паперцы аб граматыце. Зьмены у беларускай граматыце, нісустрэлі збоку ні аднага працоўнага, вучонага, вучна, студэнта, пісьменьніка, малейшай супярэчнасьці. Усе пастанову Бел. ураду аднадушна прызналі правільнай, адабрылі яе, бо яна спрашчае і палегчае правапіс, ачышчае яго ад усіх змайстраваных нацдэмамі полёнафільскіх і іншых слоў і зваротаў, якіе утрудняли працоўным разуменне мовы.

А зараз некалькі слоў аб бел. мове ў БССР.

У 1933-1934 навучальным годзе у БССР працоўць 8.600 беларускія школ, з колькасьцю больш 1-го міл. вучняў, альбо 96 проц. усіх бел. дзяцей школьнага узросту.

У БССР — 19 вышэйшых нав. устаноў, 83 тэхнікумы. У БССР 3 дзярж. бел. тэатры. Кожны район мае сваю районную друкованую газэту на роднай мове, нехакучы, ужо аб шматысячным тыражу беларускіх газэт, якія выдаюцца у Сталіцы.

Працоўны беларус з БССР нятолькі у БССР гаворыць на свэей роднай мове, ён гавора на роднай мове у Москве, Ленінградзе, калі ён гэта хоча.

Так абстаіць справа з бел. мовай у БССР.

РАБОЧАЯ, ПРАЦОЎНАЯ МОЛАДЗЬ! УСТУПАЙЦЕ Ў ШЭРАГІ СЛАЎНАГА КОМСАМОЛУ!

Усе да барацьбы з нац.-фашыстоўскай прэсай!

Беларуская буржуазія узмацняе сваю барацьбу за працоўную моладзь. Гэтай мэце яна назначала сваю буржуйска-ксяндзоўскую анучыну — „Шлях Моладзі”. Гэта газэта перэпоўнена нападамі на рэвалюцыйны рух. Часта бывае, што ў „Шляху Моладзі” творы, ці артыкулы хадэка друкуецца побач з такімі самымі — соцыялісты, народніка, радыкала ці нацыянал.-соцыялісты і г. д.” Аб гэтым ганарова осьведчае рэдакцыя гэтай фашыстоўскай газэткі. За гэта прызнаньне працоўная моладзь Зах. Беларусі павінна быць удзячна фашыстоўкай рэдакцыі. Працоўная моладзь заўсёда ведала, а камсамол заўсёды гаварыў, што ў барацьбе з рэв. рухам усе бел. бурж. партыі лучацца і змагаецца па броўкі, Беларуская буржуазія мае свае аб'яднанае кіраўніцтва пад назовам Бел. Нац. Цэнтр у Вільні (нелегальны). Але да гэтага часу імкнуцца яны так прадставіць справу, што нібы міне белхадэцый і белсанацыям, міне іх агэнтамі вядзецца барацьба. Ім патрэбна гэта на тое, каб лепш абманываць працоўные масы. „Шлях Моладзі” не вытрымаў і разбрахаў — „мы ўсе аб'еднанны”. Што іх лучыць? на гэта яны адказваюць:

„Імкненьне да незалежнасьці супольнае нашае бацькоўшчыны — Беларусі”. „За падставу ўсе мы на родную ідэалёгію, апіраючыся на хрысьцыянскай этыцы”. „Змаганьне за незалежнасьць Беларусі, буджэньне моладзі да народнае сьвядомасьці” і г. д.

Гэта ксяндзоўская незалежнасьцю — ёсьць барацьба, супроць Савецкай Беларусі за Беларусь фашыстоўскую пад пратэктаратам Гітлера, ці Пілсудскага. Гэта Беларусь, дзе беларускі буржуй ці абшарнік збізунам беларускага паліцэйсяага і шпіцля нямецкім гакенкрыцам сядзе на карк беларускіх працоўных масаў. „Шлях Моладзі” дае прыклады незалежніцтва ў Б.Н.Р. Гэта бел. народная рэспубліка, на чале якой стаяў польскі князь і вялікі абшарнік Ськірмунт, паны Луцкевічы, ксёндз Гадлеўскі і ін. (З „Шляху Моладзі” яшчэ не ўсьпелі тады, але затые мараць у пер аб добрых мейсцах, уніформах і бел. шаблях ў буржуазнай Беларусі). Гэта рэспубліка якая адбірала зямлю ад сялян, фабрыкі ад рабочых, якая высылала прывітальныя тэлеграмы да нямецкага кайзэра Вільгэльма. Угодкі аб'вяшчэньня гэтай рэспублікі сьвяткуе ў апошнія годы беларуская буржуазія і яе малодшые наследнікі з „Шл. Мол.„.

Але такая фашыстоўская рэспубліка можа паўстаць толькі з разбуранай Вольнай Савецкай Беларусі. Дзело гэтай ўся брудная пісаніна „Шл. Мол.” скіравана супроць БССР і рэвалюцыйнага руху З.Б.

Дзеля гэтага яны ўзьнялі крык аб „знiстажэньнi бел. культуры” ў сувязі са зьменай у беларускім правапісе. Дзеля гэтага так крычаць аб арышце сваіх кумпаноў: Дварчаніна, Рак-Міхайлоўскага і інн. Бо гэта вялікая перамога рэвалюцыйнага руху і ўдар на нац. фашызме, дзеля тэтага яны праслаўлююць ў сваей анучы-газэце „герояў” контррэвалюцыйнага паўстаньня ў Слуцку. Дзеля гэтага ўся іх правакацыйная пісаніна і праца!

Такім чынам „Шл. Мол.” гэта — рашучы вораг працоўнай моладзі. Але адным „Шл. Мол.” бел. буржуазія задаволіцца ня можа. Яна створыла яшчэ фашыстоўскую студэнскую арганізацыю „Скорынія”, яна ад часу да часу выдае „Новую Варту”. Па прыкладу украінскага фашызму імкнецца тварыць вайсковые курсы.

Як слуцкія паўстанцы, так і цяперашныя буржуйскія незалежнікі ўважаюць бальшавікоў за найвялікіх ворагоў нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі. Яны пішуць „Баларусь сёньня таксама подзелена. Трэба быць прыгатаваны на тое, каб ізноў у вялікую гістарычную хвіліну мы маглі прамовіць не мэморыяламі дамарослых дыпляматаў, але гатовасьцю барацьбы, гатовасьцю злажэньня свайго жыцьця за лепшую, бо незалежную волю і долю Беларусі („Нов. Варта” стр. 2.).

А для таго, што Пілсудскі творыць свае легёны ў барацьбе за Польшчу, так і беларусы павінны тварыць свае легёны ў барацьбе за падобную Беларусь, як каже „Н. Варта”. Як бачуць фашысты, працоўная моладзь добра ведае і адчувае Польшчу Пілсудскага і будзе воспаядваць белар. фашыст. рэспубліка,

Так успамагаючы і дапаўняючыся вядуць сваю контррэвалюцыйную працу бел. нацыянал-фашысты сярод працоўнай моладзі.

Працоўная моладзь ЗБ павінна гнаць прэч ад сябе ўсіх гэтых агэнтаў, буржуяў і кулакоў. Выход з цяперашнага палажэньня толькі; уся ўлада Саветам Рабочых і працоўных сялян,

У абароне БССР і СССР выступаем злучанымі радамі.

Усюды, дзе толькі прыходзяць гэтые буржуйскія газэты-анучы чыніць ім зараз-же хайтуры і гнаць вон з працоўнага асяродзьдзя.

КАРАСПОНДЭНЦЫІ

ГЭРАІЧНАЯ БАРАЦЬБА РАБОЧЫХ ПАДАРОСКІХ ФАЛЬВАРКАЎ

У фальварках Падароўскага раёна сыстэматычна зніжаецца аплата працы. Дашло ўже да такой нізкай аплаты як 1 зл. 50 гр. за косьбу, 1 зл. 80 гр. за возку гною, 70 гр. за працу ад цёмнага да цёмнага ў полі і агародзе. Пры такіх заработках далей немагчыма было існаваць і мы пачалі ў час веснавых палявых работ рыхтавацца да забастоўкі. Правелі мы шэраг нарадаў з батракамі, ў першую чаргу з моладзьдзю з так званымі пасылкамі якіе зараблялі за цалы дзень цяжкай працы 70 грошы. Пасьля гэтага мы абралі забастовачны камітэт у складзе 7 рабочых у тым ліку 3-х чалавек моладзі.

Забастовачны камітэт выставіў наступные патрабаваньня:

1) 1 зл. 50 гр. за дзень для пасылкоўцаў.

2) 3 зл. 50 гр. за касьбу лугу.

3) 4 злоты за возку гною.

Да забастоўкі прыступілі рабочые трох фальваркаў у ліку 260 чал. Да забастоўкі прылучыліся таксама возчыкі дзерава з тартакоў і фабрык і рабочые распаложанай блізка цагельні. Усяго такім чынам бастуе 800 чалавек рабочых.

У зьвязку з пашырэннем забастоўкі мы абралі яшчэ 2 камітэты і цэнтральны забастовачны камітэт задача каторага — кіраўніцтва ўсей акцыяй.

Абшарнік і паліцыя усякімі спосабамі імкнуліся сарваць забастоўку. Яны пасылалі ламістрайкоў, каторых альбо мы выганялі, альбо пад уплывам нашай агітацыі самі кідалі работу.

Паліцыя арыштавала больш 100 чалавек бастуючых рабочых, якіе негледзячы на катаванні невыдалі ніаднага члена забастовачнага камітэту.

Негледзячы на тэрор, катавання забастоўка працягваецца, рабочые гэраічна змагаюцца за выстаўленые камітэтам патрэбаванні.

Нам актыўную дапамогу аказваюць селяне акалічных вёсак і рабочые мястэчак якіе правелі некалькі масовак абралі 3 камітэты дапамогі бастуючым, збіраюць прадукты для нашых сямяў. Сярод бастуючых рабочых пануе баявы настрой і рашучасьць змагацца да перамогі. Рабочые ўпэўнены ў сваю поўную перамогу таму, што імі керуе іх родная камуністычная партыя і камсамол.

Малады батрак.

Толькі масавые рэвалюцыйные выступленні гарантуюць перамогу

У Шчароўскім раёне Новогрудзкай акругі сяляне 3 дні баставалі — нявыходзілі на шарваркі.

Нягледзечы на тэрор сяляне у працягу трох дзён нехацелі выконваць шарварковых павіннасьцей. На работу „пайшлі” пасьля крывавай пацыфікацыі пад дубінкамі паліцыі.

Гэраічнасьць і рашучасьць Шчароўскіх сялян у барацьбе з акупантам павінны служыць прыкладам для усіх сялян у барацьбе супроць шарваркаў. Аднак мы павінны бачыць і буйнейшы недахоп у барацьбе Шчароўскіх сялян. Яны, недавелі справу да конца — не арганізовалі адпору паліцыі, не выгналі арганізованую карную экспэдыцыю. Кожны рэвалюцыйны змагар павінен знаць, што фашызм ня грэбае любымі сродкамі у барацьбе з рэвалюцыйным рухам і пагэтаму мала толькі арганізаваць барацьбу супроць шарваркаў, падаткаў альбо камасацыі. Трэба разам з гэтым быць падрыхтаваным да адпору пацыфікацыі. Іменна з гэтаю мэтаю мы павінны пашырыць барацьбу адной вёскі на суседніе, бо толькі аб'еднана, масавымі выступленнямі здолеем зламаць фаш. тэрор.

*** У Ружанскім раёне Слонімскай Акругі партыя і камсамол арганізавала антыпадатковую барацьбу сялян 8 вёсак. Была арганізована масавая самаабарона і чырвоные гонцы. Сяляне васьмі вёсак у працягу васьмі дзён і ночэй былі ў боевой гатоўнасьці Паліцыя акружыла цалы раён, тэрорызуючы насельніцтва. Але гэтым неўдалося зламаць гэраічнай упартасьці змагароў. Бачучы такі баявы настрой паліцыя не пасьмела напасьці ведаючы якое спатканне падрыхтовалі для яе сяляне і рашыла вернуцца на пастэрунак. Наша арганізацыя ўпэўніўшыся, што паліцыі няма распусьціла самаабарону, ўсе пашлі па хатам спаць. Паліцыя толькі гэтага і чакала. Захапіўшы знянацку абезброеным сялян азьверэлая банда паліцыянтаў граміла ўсіх і ўсё што пападалося ей па дарозе.

Мы абавязаны зразумець, што паліцыя на кожны факт рэвалюцыйнай барацьбы адкажа тэрорам. Недапусьціць да тэрорызавання, адбіць карную экспэдыцыю можна толькі пры пастаянай пільнасьці і гатоўнасьці да масавай барацьбы.